# Танцавальная восень у Нью-Йорку

***Актыўныя згадкі пра леташнюю стажыроўку, кантакты паміж дзеячамі мастацтваў розных краін свету — рэаліі сённяшняга дня. Не з'яўляецца выключэннем і Беларусь. Як доказ — плённае творчае супрацоўніцтва выкладчыкаў і студэнтаў кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў з амерыканскімі харэографамі, якое стала магчымым дзякуючы падтрымцы пасольства ЗША ў Беларусі і зацікаўленасці ў такіх кантактах кіраўніцтва універсітэта.***

А пачыналася ўсё з задумкі ажыццявіць сумесны беларуска-амерыканскі праект у галіне сучаснай харэаграфіі. Ініцыятарамі выступілі тагачасны аташэ па пытаннях інфармацыі, адукацыі і культуры амбасады ЗША Даяна Макдональд і я, аўтарка гэтых радкоў. Сучасны танец быў абраны не выпадкова. Цікавасць да сучаснай харэаграфіі ў нашай краіне была і ёсць немалая, але адчуваўся (адчуваецца і дагэтуль) востры недахоп кваліфікаваных кадраў і інфармацыі пра тое, што ў гэтым накірунку рабілася ў свеце. Адна з прычын такой сітуацыі — табу, якое існавала ў савецкі час адносна мастацкіх накірункаў, што не ўпісваліся ў шэраг "афіцыйна прызнаных". Гады забароны нанеслі развіццю сучаснага танца прыкметную шкоду, якая адчуваецца на ўсёй постсавецкай прасторы. Шмат зрабіў і робіць дзеля папулярызацыі сучаснай харэаграфіі Міжнародны фестываль у Віцебску, але адных яго намаганняў відавочна недастаткова.

І вось летась у чэрвені на кафедру харэаграфіі прыехалі госці з Нью-Йорка: харэограф Нэта Пульвермахер, кіраўнік трупы сучаснага танца "Neta dance company", і яе памочнік, танцоўшчыца Брытні Рыз. Мэта візіту — паставіць з беларускімі танцорамі некалькі нумароў з рэпертуару трупы. Удзельнічаць у праекце прапанавалі студэнтам са спецыялізацыяй "народны танец", "бальны танец" і "эстрадны танец" . У выніку прагляду амерыканскія харэографы выбралі 18 чалавек, і праца закіпела. За два тыдні штодзённых шматгадзінных рэпетыцый было падрыхтавана шэсць харэаграфічных кампазіцый, галоўным чынам урыўкаў з балетаў у пастаноўцы Н.Пульвермахер. Яны з вялікім поспехам былі прадэманстраваны на сцэне Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра эстрады ў форме канцэрта пад назвай "Адна вясёлка, пяць ложкаў ды шэсць вівальдзіянак". Амерыканскія харэографы адзначылі высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі нашых студэнтаў, іх акцёрскія здольнасці, працавітасць і імкненне дасканала рабіць сваю справу.

Акрыленыя поспехам сумеснай работы, Нэта і Брытні, вярнуўшыся ў ЗША, пастараліся, каб некалькі беларускіх удзельнікаў праекта атрымалі запрашэнне ў Нью-Йорк. У асобе каардынатара культурных праграм Дзяржаўнага дэпартамента ЗША Кэтрын Вейнскот яны знайшлі аднадумцу і памочніка, дзякуючы намаганням якой такі візіт і адбыўся ў кастрычніку таго ж года. Амерыканцы запрасілі на стажыроўку, акрамя мяне, выкладчыцу кафедры Наталлю Карчэўскую, нашу аспірантку Вольгу Шамрову і студэнта Дзмітрыя Мірановіча.

Нам была прадастаўлена магчымасць пазнаёміцца як з сучаснай харэаграфіяй Нью-Йорка (мадэрнам, джазам, хіп-хопам, contemporary dance і іншымі яе відамі), так і з тым, што ўвогуле ўяўляе сабой сёння сучасная амерыканская харэаграфія. Праграма была насычанай і прадуманай да дробязей. Мы наведвалі дзяржаўныя спецыяльныя навучальныя ўстановы, бралі ўрокі ў прыватных танцавальных студыях і школах, бывалі на рэпетыцыях і канцэртных выступленнях вядомых калектываў сучаснага танца, правялі майстар-клас па беларускім танцы. Незабыўныя былі таксама прагулкі па Нью-Йорку і наведванне музеяў, гэтаксама як і знаёмства з факультэтам харэаграфіі Нью-Йоркскага універсітэта, альбо New York University's Tisch School of the Arts.

Дэкан факультэта Лінда Тарнэй правяла экскурсію па залах, пазнаёміла з 80-гадовай выкладчыцай "сістэмы пілатэс" (сістэмы расцяжак), якая з'яўляецца вучаніцай стваральніка гэтай сістэмы, названай яго імем. Мы наведалі заняткі і папрысутнічалі на генеральнай рэпетыцыі канцэрта, падрыхтаванага студэнтамі-харэографамі і складзенага галоўным чынам з танцавальных нумароў у іхняй уласнай пастаноўцы.

Прапанаваныя харэаграфічныя кампазіцыі ўразілі неардынарнасцю мыслення пастаноўшчыкаў, вынаходлівасцю ў лексіцы і бездакорным выкананнем. Асабліва запомніўся нумар, які ўяўляў сабою смелую, выкананую сродкамі сучаснага танца пародыю на сусветна вядомы шэдэўр М.Пеціпа — карціну "Цені" з балета Л.Мінкуса "Баядэрка". Нумар не атрымаўся б без добрага ведання арыгінала. Тут наогул дарэчы адзначыць сур'ёзнае і паважлівае стаўленне амерыканцаў да класічнага танца, які за акіянам лаканічна называюць "балет". З заняткаў класічным трэнажом пачынаюць свой працоўны дзень танцоўшчыкі стылю contemporary dance і джаза, выканаўцы мюзіклаў і спартыўных бальных танцаў; з класічнага танца пачынаюцца ўрокі ў спецыяльных навучальных установах і шматлікіх прыватных студыях.

Менавіта з балетам звязана і яшчэ адно наша моцнае мастацкае ўражанне. Мы мелі магчымасць паглядзець спачатку ў балетнай зале падчас рэпетыцыі, а потым на сцэне балет "Сімфаньета" І.Кіліяна на музыку Л.Янача ў выкананні трупы ABT (American Ballet Theatre), аднаго з вядучых амерыканскіх балетных калектываў. Танцоўшчыкі скаралі ў першую чаргу высокай культурай мужчынскага танца, дзе непарушная правільнасць рухаў любой цяжкасці, мяккія прызямленні пасля высокіх і магутных скачкоў, злітныя пераходы надавалі танцу асаблівую плаўнасць і чароўнасць. Сімвалічна, што ў рэпертуары шматнацыянальнай трупы (сярод салістаў — прадстаўнікі Украіны, Аргенціны, Кубы, Іспаніі, Італіі, Бразіліі, Францыі і Англіі), акрамя спектакляў сучасных амерыканскіх і еўрапейскіх харэографаў, пастаянна захоўваюцца і балеты пачатку XX ст., такія, напрыклад, як "Сільфіды" ("Шапэніяна"), "Прывід ружы" і "Лебедзь", пастаўленыя М.Фокіным, які некаторы час працаваў з трупай.

Спадабалася харэаграфія Эліёта Фельда, які ставіць нумары для самога Міхаіла Барышнікава. У тэатры Джойс мы глядзелі праграму, створаную Фельдам для ўласнай трупы сучаснага танца ("Man dance project"). Для ўвасаблення мастацкіх задум харэографа патрабуюцца спецыяльныя, часта davoлі складаныя, тэхнічныя прыстасаванні. Напрыклад, сцяна па цэнтры сцэны, "у плоскасці" якой адбываецца пластычнае дзеянне адной з харэаграфічных мініяцюр. Тры танцоўшчыкі, трымаючыся за ўбітыя ў гэтую сцяну калкі і ніводнага разу не дакранаючыся да падлогі, стараюць вобразы спартсменаў-бегуноў на доўгую дыстанцыю: адзін нязменна лідзіруе, другі распіхвае супернікаў, трэці не вытрымлівае зададзенага тэмпу і адмаўляецца ад барацьбы і г.д. Дзеля ўзмацнення мастацкага ўражання вельмі ўдала выкарыстаны пастаноўшчыкам прыём "запаволенай здымкі". Назва нумара, якую можна перакласці як "Размовы за спінай", выяўляе філасофскі падтэкст твора: наша жыццё часта падобнае да бясконцага бегу.

*(Працяг будзе)*

**Святлана ГУТКОЎСКАЯ,**
**загадчык кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**



**Беларуская дэлегацыя на факультэце харэаграфіі Нью-Йоркскага універсітэта з выкладчыцай сістэмы пілатэс.**



**Сцэна са спектакля ABT.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ